**Настасіч Н.Г. (Мінск)**

## Спадчына Максіма Танка
## ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры

У гэтыя дні наша грамадскасць рыхтуецца адсвяткаваць 100 гадоў са дня нараджэння Народнага пісьменніка Беларусі Максіма Танка (Яўгена Іванавіча Скурко). За восемдзесят два гады, што ён пражыў, паэт пакінуў нам вялікі скарб літаратурных шэдэўраў, прыклад цвёрдай грамадзянскай пазіцыі, памяць пра шчодрасць і адкрытасць беларускай душы. Сёння застаўся толькі светлы сум, што гэтага чалавека больш няма. Засталіся кнігі паэзіі і прозы, якія ўвабралі ў сябе фарбы і колеры роднай зямлі і мовы, раскрыўшы іх адметнасць і прыгажосць. Творчасць аўтара выйшла за гарызонты свайго часу, на абсягі новай эпохі, XXI стагоддзя. У час нанатэхналогій традыцыі розных народаў пераплятаюцца і аб'ядноўваюцца паміж сабой. Кожны чалавек становіцца цікавы сваёй адметнасцю, як носьбіт культуры. Таму для наведвальнікаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры спадчына, якую пакінулі ў свой час паэт і яго сваякі ўяўляе сабой культурную каштоўнасць.

У сценах нашай установы праводзіцца праграма мерапрыемстваў, мэтамі якіх з'яўляецца ўшанаванне памяці Максіма Танка і прапаганда яго творчасці для моладзевай аудыторыі, якая ў асноўным і наведвае музей. Дзеля гэтага была зроблена перасоўная планшэтная выстава "Гартаючы жыцця свайго старонкі…", якая распавядае пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Яна  ахоплівае не толькі дзейнасць паэта ў межах беларускай культуры, але і распавядае пра яго сяброўскія адносіны з прадстаўнікамі іншых народаў, раскрывае перакладчыцкую дзейнасцьна нацыянальную мову лепшых твораў сусветнай літаратурнай класікі. Згаданая мабільная экспазіцыя – гэта своеасаблівы жыццяпіс Максіма Танка, сучасны расповед пра яго, асэнсаванне яго спадчыны.

Шлях да зорнага пісьменніцкага небасхілу распачаўся для Яўгена, такім было сапраўднае імя паэта, з Нарачанскага краю, дзе ён нарадзіўся 17 верасня 1912 года ў сялянскай сям'і Домны і Івана Скурко. У кожнага творцы – свой куток зямлі, як кажуць «зямляабетаваная», празпрызмуякой мастак глядзіць на свет. Такім месцам для будучага Максіма Танка стала вёска Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, дзе пабудавалі хату яго бацькі. "Малая радзіма" была той крыніцай натхнення, якая жывіла яго паэзію ўсё жыццё:

Парог, вычасаны з успамінаў,
Астаўся за мной;
Дзверы на завесах цвыркуновайпесні,
Асталіся за мной;
Вокны, зашклёныявачаміблізкіх,
Асталіся за мной,  –

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Як жа мне не азірнуцца назад,
Наваткалі б я застыў
Слупомсолі? [1, с. 304]

Казкі і песні матулі Домны моцна паўплывалі на ўспрыняцце Жэнем свету, на яго густы. “Кожная гісторыя – успамінаў паэт – пакуль стане гісторыяй, абапёртай на факты і дакументы, - пачынаецца з легенды ці казкі. Біяграфія – гісторыя чалавека. І я пачынаю яе з успамінаў казак сваёй маці.” (“Лісткі календара”, 20.II.1936). Нават верлібр, які так моцна палюбіў Максім Танк у творчасці, меў сваімі вытокамі вусныя народныяпесні. У беларускім фальклоры існуе напеў, але незаўсёды захоўваецца рыфма.

Яшчэ зусім малым хлопецужо цягнуўся да кніг, меў неатоленую прагу да ведаў. Спачатку ён хадзіў у Шклёнікаве і Сватках у польскую пачатковую школу, потым вучыўся ў Вілейскай рускай і Радашковіцкай беларускай гімназіях. За ўдзел у школьнай забастоўцы, накіраванай супраць ліквідацыі беларускіх школ, у 1928 годзе яго выключылі з навучэнцаў знакамітай Радашковіцкай гімназіі. Ён паехаў у “крывіцкую Мекку” для маладых талентаў (па сл. У.Жылкі), у Вільню. Сяброўства з такімі асобамі, як У.Самойла, А.Станкевіч, Р.Шырма, Е.Путрамэнт, Г.Дэмбінскі, Ё.Каросас узбагацілі паэта духоўна. Менавіта тут ён працягнуў вучыцца у беларускай, а потым Віленскай рускай гімназіі імя А.С.Пушкіна, выдаў свае першыя кнігі, вёў падпольную барацьбу за вызваленне Заходняй Беларусі. Горад стаў для будучага пісьменніка пераломным і ва ўласным жыцці: ён сустрэў сваё каханне, прыгажуню з дзіўным імем Любоў, якая стала спадарожніцай Максіма Танка на ўсё жыццё.

У старажытнай Вільні Жэнен Скурко прайшоў і свой “жыццёвы універсітэт”. Творчая атмасфера, дух незалежнасці і самадастатковасці вітаў у паветры, даваў магчымасць маладым людзям актыўна праяўляць свае здольнасці. Такая пазіцыя не вельмі падабалася кіруючым у той час польскім уладам. За супрацоўніцтва ў легальных і нелегальных выданнях камуністычнага характару і рэвалюцыйную пазіцыю паэт трапляў пад увагу паліцыі і за краты ў Лукішскую турму. Упершыню творцу затрымалі ў красавіку 1932 года. Пад увагу ахоўнікаў правапарадка трапіў часопіс “Пралом”, у двух экзэмплярах выдадзены Жэнем Скурко і мастаком Янкам Гарохам. “На вокладцы, – успамінаў Максім Танк, – Янка Гарох намаляваў разбураную турэмную сцяну. На руінах яе стаіць рабочы. У адной руцэ ў яго молат, у другой – чырвоны сцяг” [2, с. 12]. А у 1936 годзе была ўзбуджана ўжо чарговая судовая справа з-за першай кнігі маладога паэта Максіма Танка, якая была названая аўтарам вельмі сімвалічна – “На этапах”. Дарэчы кніжка пабачыла свет па ініцыятыве знакамітага Рыгора Шырмы. Ён угаварыў свайго сябра В.Труцько стаць выдаўцом зборніка. Кнігу канфіскавалі, а над выдаўцом і паэтам навісла пагроза турэмнага зняволення на некалькі месяцаў. Аднак выданне заўважылі і далі яму добрую адзнаку, адбылося “баявое хрышчэнне” пісьменніка.

17 верасня 1939 года з Чырвонай арміяй Савецкага Саюза на зямлю Заходняй Беларусі прыйшла з усходу доўгачаканая свабода. Гэтым падзеям

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

суджана было адбыцца ў дзень нараджэння будучага Народнага паэта Максіма Танка. Ён успамінаўу адным са сваіх інтэрв'ю: “Ну, Максім – гэта ад Горкага, пад уплывам якога мы ўсе тады знаходзіліся. А Танк… нават сам не магу добра растлумачыць: чаму Танк? Як многім пачынаючым паэтам, мне здавалася, што літаратурны поспех залежыць  і ад гучнага псеўданіма. Свет “раслінных” псеўданімаў быў ужо, што называецца, разабраны: Колас, Чарот, Пушча, Васілёк… Мне нічога не заставалася, як пашукаць што-небудзь “жалезнае”, вось я і спыніўся на Танку. Ведаў я тады ці не ведаў, што гэта слова мае адносіны і да вершаў: танка – адзін з класічных жанраў японскай і карэйскай паэзіі?.. А танкі з чырвонымі зоркамі на вежах, якія прынеслі нам свабоду, былі саснёны, і, магчыма, сэрца падказала, што надыдзе такі дзень…” [3, с. 3].

Праца ў віленскіх перыядычных выданнях 1930-х гадоў, газетах “Наша воля”, “Беларускае жыццё”, “Poprostu”, часопісах “Беларускі летапіс”, “Калоссе” у якасці журналіста, крытыка і пачынаючага пісьменніка прынесла свае плады. Былі выдадзены кнігі паэта “Журавінавы цвет” (1937) і “Пад мачтай” (1938). “Паэзія наша – цяжкая, як камень, вырваны з бруку пад час вулічных баёў, немілагучная – як стогн і крык, чырвоная – як пралітая кроў”, піша Танк у “Лістках календара”.

прыходам савецкай улады для 27-гадовага аўтара адкрыліся новыя магчымасці. Ён працуе ў родных ваколіцах, у газеце “Вілейская праўда”, а з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны камандзіруецца ў Маскву ў штаб рэдакцый  газет “Раздавім фашысцкую гадзіну” і “За Савецкую Беларусь”, якую ў той час узначальваў Міхась Лынькоў, у будучым адзін з самых блізкіх сяброў паэта. З-пад пяра неабыякавага Танка, выходзяць палымяныя вершы і сатырычныя апавяданні. У 1943 годзе друкуецца знакамітая паэма “Янук Сяліба”, якую чыталі і перадавалі адзін аднаму ў кішэню беларускія партызаны ў перапынках паміж баямі.

У трыццаць шэсць год Максім Танк стаў галоўным рэдактарам самага адметнага ў БССР літаратурнага часопіса “Полымя”. У складзе савецкіх дэлегацый ён шмат вандраваў па замежным краінам, бываў у Заходняй Еўропе, у ЗША, Чылі, у Кітаі і Японіі, тройчы прадстаўляў дзяржаўныя інтарэсы краіны ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Максім Танк быў удзельнікам Першага сусветнага кангрэсу прыхільнікаў міру. Гэта знайшло адлюстраванне ў паэме “Пражскі дзённік” (1949), дзе ўздымаецца праблема лёсу чалавецтва, актуальная і сёння, у XXI стагоддзі. Потым ён будзе ўдзельнічаць ў пасяджэннях за абарону міра на Зямлі не адзін раз.

Шмат вершаў ён прысвяціў сваім уражанням ад традыцый розных культур. Узніклі сапраўдныя шэдэўры, прысвечаныя яго падарожжам: “У Парыжы”, “Палёт над айсбергамі”, “Мост вечнага спакою”, “Вецер радзімы”, “Касмалогія”, “Ля падножжа Охас-дэль-Салады”, “У Хірасімскім музеі”, “Трэска з дома Шэкспіра”. Вандруючы, па ўспамінах сына, пісьменнік імкнуўся трапіць на рынак, бо там, як нідзе, можна было адчуць менталітэт мясцовых жыхароў, убачыць краіну ў паўсядзённым жыцці. Ехаў Максім Танк з маленькім чамаданчыкам, а вяртаўся з некалькімі вялікімі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напрыклад, з Амерыкі, ён прывёз чамадан гальштукаў і кожнаму са знаёмых літаратараў падарыў. Любіў Танк, як ўсе творчыя асобы, прывозіць і незвычайныя рэчы, звязаныя з наведанымі мясцінамі. Напрыклад, з Чылі ён прывёз кавалак меднай руды на памяць, а з Англіі трэску ад дома, дзе працаваў знакаміты У.Шэкспір (сёння гэтыя рэчы захоўваюцца ў музеі).

З 1966 па 1990 год Максім Танк узначальваў Саюз пісьменнікаў Беларусі, быў актыўным членам камісіі па літаратурных сувязях у СССР. Ён шмат сіл паклаў для папулярызацыі літаратур нацыянальных меншасцяў у складзе магутнай савецкай дзяржавы. Падчас сустрэч з дзеячамі культуры на чужыне пісьменнік абменьваўся вопытам, завязваў сяброўскія адносіны, імкнуўся перакласці вядомыя літаратурныя творы. Ш. Петэфі, Н. Хікмет, Дж. Байран, А. Міцкевіч, Ю. Тувім, У. Бранеўскі, Ю. Славацкі, М. Горкі і У. Маякоўскі, А. Твардоўскі, Т. Шаўчэнка і І. Франко, П. Тычына, М. Рыльскі, М. Бажан, У. Сасюра і С. Тудор, Т. Цільвіціс, А. Венцлава і Э. Межалайціс, Я. Судрабкалн і М. Кэмпе – класікі і выдатныя сучаснікі, творы якіх перакладаў Максім Танк на беларускую мову. Вершы самога Танка выходзілі асобнымі выданнямі на рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, узбекскай, таджыкскай, казахскай, польскай, балгарскай, карэйскай і іншых мовах. У спадчыне паэта пераклады твораў звыш як ста шасцідзесяці паэтаў свету – “яскравае сведчанне не толькі маштабаў перакладчыцкай дзейнасці і шырыні Максіма Танка, але і інтэнсіўнасці, абсяжнасці ягоных пошукаў, імкнення да універсальнасці” [4, с. 195].

“Кожная мова – пісаў творца – гэта непаўторны скарб, якім трэба даражыць. З выкрэсліваннем яе не толькі ты становішся нікім, але і бяднее, губляе многа непаўторных якасцей міжнародная культура…Вось ёсць, скажам, з боку мовы, здавалася б, бедныя народы. Але тыя ж чукчы на адно толькі акрэсленне снегу маюць каля сотні слоў.Ні ў адной з самых развітых еўрапейскіх моў мы гэтага не знойдзем. Вось і перакладай… Здавалася б, куды ўжо багатая руская мова, а вось: “миру – мир”. Не хапіла табе аднаго слова… Я люблю сабаку і люблю чалавека. Я люблю і я кахаю – гэта ж два розныя словы. А ўжо такая багатая мова, такая багатая. І так поўна, усюды. Мова – гэта неад’емная якасць кожнага чалавека, і трэба даражыць гэтай якасцю. Справа не толькі ў тым, што гэта твая мова; калі ты даражыш мовай сваёй, то ты будзеш даражыць і мовай суседа.Таму што праз яе ты завязваеш кантакт з іншымі, узмацняеш братэрскія сувязі і самога сябе. Чым жа ты ўзмацніш – кілбасой?..” [5, с. 71].

Ужо напрыканцы жыцця, у 1991 была выдадзена кніга яго перакладаў “На зорных шляхах”. Дакранаючыся да скарбніц іншых культур, пісьменнік гаварыў, што ўсюды ёсць прыгожыя мясціны, але самыя светлыя, самыя лепшыя вершы ён пісаў на роднай зямлі…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як вандроўны мастак,
Я заўсёды з сабою нашу
Краявіды радзімы… [6, с. 615]

У жыцці і творчасці Максіма Танка ёсць асобная старонка – гэта яго блізкае і плённае сяброўства з польскімі і літоўскімі пісьменнікамі (А. Жукаўскасам, Ё. Каросасам, Е.Путрамантам, М.Жулаўскі, Я.Адамскі і інш.). Са многімі з іх ён пазнаёміўся яшчэ ў маладосці, калі жыў у Вільні, захаваўшы сувязі на ўсё жыццё. Дні беларускай культуры ў гэтых краінах сталі традыцыйнымі, дзякуючы намаганням паэта. На працягу многіх гадоў пісьменнік узначальваў Камітэт беларуска-польскай дружбы, спрыяў выданню кніг беларускіх аўтараў (М.Багдановіча, Я.Брыля і інш.) у Лодзінскім выдавецтве ПНР. За ўнёсак у развіццё братэрскіх адносін з суседнімі народамі Максім Танк атрымаў ордэн Дружбы народаў, быў узнагароджаны афіцэрскім крыжам Адраджэння Польшчы, ордэнам Заслугі ПНР. Па ўспамінах сябра паэта Івана Шамякіна, калі прыязджала савецкая дэлегацыя, да Танка заўсёды вельмі цёпла ставіліся, адчувалася радасць гаспадароў ад сустрэчы з ім.

Сын пісьменніка ўспамінаў, што напрыканцы 1980-х гадоў бацька цяжка захварэў. Яму трэба было ставіць стымулятар сэрца, які цяжка было дастаць. Дазнаўшыся пра гэта, літоўскія сябры адразу ж запрасілі яго ў Вільню, і там паставілі бельгійскі стымулятар. У лячэбніцы паэта наведвалі першы сакратар кампартыі ЛССР, старшыня Савета міністраў… Шырыня інтарэсаў пісьменніка, яго адкрыты характар і павага да культуры іншых краін дапамагалі Максіму Танку наладжваць добрыя адносіны з замежным творчым асяроддзем, што спрыяла ўзбагачэнню і нашай, беларускай літаратуры.

Танкаўскія нясупынныя пошукі магчымасцяў – пазнаваць, сябраваць, пісаць, глыбіня яго светапогляду дапамаглі паэту выйсці за рамкі савецкай ідэалогіі, зазірнуць у будучыню, за гарызонты новай эпохі. У рытме свайго арытмічнага сэрца паэт піша верлібры на самыя розныя тэмы: пра родны нарачанскі край, пра пераломныя падзеі гісторыі краіны, праблемы беларускага грамадства, інтымны свет кожнага чалавека, радасць існавання, каханне, пра шляхі, якія мы выбіраем. Свой шлях ён выбраў, і прайшоўшы ўсе выпрабаванні, застаўся верным сабе, сям'і, сябрам, радзіме. Максім Танк стаў чалавекам сусветнай прасторы – вялікага зямнога свету, выбранцам духоўнай спадчыны беларускай зямлі…

У юбілейны 2012 год сын пісьменніка Максім Яўгенавіч Скурко перадаў у Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры шмат рэчаў, звязаных з жыццём знакамітага паэта. Яны сталі каштоўнымі прадметамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фондаў музея. Сярод іх скураны партфель, з якім пісьменнік хадзіў на працу, рарытэтныя сямейныя і сяброўскія фотаздымкі, сувенірныя фотаальбомы, аўтарскія рукапісы і сшыткі з нізкамі вершаў, кнігі з аўтографамі вядомых людзей, падараваныя у свой час пісьменніку, кнігі пачатку XX стагоддзя, якімі карыстаўся Максім Танк падчас вучобы, мастацкія работы П. Сергіевіча і М.Гуціева. Выкарыстоўваючы гэтыя рэчы і дзякуючы танкаўскім матэрыялам, ласкава прадастаўленым Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва,была зроблена вышэй згаданая экспазіцыя, якая будзе вандраваць па ўстановах Беларусі і завітае ў суседнія краіны, каб прадставіць аднаго з лепшых дзеячаў беларускай культуры XX стагоддзя.

Супрацоўнікамі музея плануецца правесці да канца года шэраг асветніцкіх мерапрыемстваў, прысвечаных асобе Максіма Танка. Але галоўнае ўрачыстае святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння творцы адбудзеца 15 верасня 2012 года на “малой радзіме” песняра ў Мядзелі.Там будзе прэзентавацца і другая выстава, зробленая па выніках міжнароднага фотаплэнера. Яна называецца “Дарогамі Максіма Танка”. Экспазіцыя адлюструе фотаработы знакамітых майстроў і прадставіць сабою калаж старых здымкаў часоў Максіма Танка (у тым ліку яго ўласных) і здымкаў мясцін, па якім ён вандраваў, на сённяшні дзень. У наведвальнікаў выставы будзе цудоўная магчымасць успомніць былое, паглядзець на узоры фотамастацтва і бліжэй пазнаёміцца з творчасцю Максіма Танка. Сярод вядомых фотамастакоў – С.Плыткевіч, В.Сібрыкаў, В.Ракевіч і інш.

Усіх зацікаўленых людзей запрашае 15 верасня на Мядзельшчыну, каб святочна адзначыць культурную падзею – юбілей нашага славутага земляка.

Літаратура

1. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: выбраныя тэксты для чытання і аналізу / уклад. Л.Баршчэўскі. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 496с.

2. Бугаёў, Д.Я. Паэзія Максіма Танка / Д.Я. Бугаёў. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 311 с.

3. Інтэрв’ю з Максімам Танкам / З сэрца здабываць песні // Вячэрні Мінск. – 1974. – ад 15 кастрычніка. – С. 3.

4. Бечык, В.Л. Выбранае / В.Л. Бечык. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 478 с.

5. Мікуліч, М.У. Максім Танк: На скразняках стагоддзя / М.У. Мікуліч. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 254с.

6. Танк, М. Збор твораў / Максім Танк; прадм. М. Мікуліча. – Мінск, 2010. – 1008с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ